**Протас, В.** 21 месяц у пясках чужой краіны / В. Протас ; гутарыў С. Райчонак // Кліч Радзімы (Шаркаўшчына). — 2021. — 13 лют. — С. 1—2.

## 21 МЕСЯЦ У ПЯСКАХ ЧУЖОЙ КРАІНЫ

***Паслязаўтра, 15 лютага, спаўняюцца 32 гады з таго моманту, як апошні савецкі салдат пакінуў тэрыторыю рэспублікі Афганістан. Задачы па недапушчэнні нападу на паўднёвыя рубяжы СССР і аказанні дапамогі ўраду ДРА ў барацьбе з незаконнымі бандфарміраваннямі былі выкананы. Воіны-інтэрнацыяналісты вярталіся на Радзіму…***

***Вогненнымі дарогамі Афганістана прайшлі 30 тысяч беларусаў, сярод якіх больш 60-ці шаркаўчан. Многія з іх вярнуліся на радзіму з высокімі баявымі ўзнагародамі. Пад палаючым небам гэтай паўднёвай краіны амаль два гады служыў старшыня Шаркаўшчынскай раённай арганізацыі грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане» Васілій Протас, з якім мы сустрэліся з нагоды чарговай гадавіны вываду савецкіх войск з Афганістана.***



– **Васілій Савіч, што для Вас значыць Афганістан?**

– Асабіста для мяне гэта не проста паўднёвая краіна, а перыяд жыцця, які назаўсёды застаўся ў памяці. Нельга забыць цяжар той вайны, якая незагойнай ранай баліць ў сэрцы. Бо давялося зведаць усё: адчай, боль, горыч страт сяброў-саслужыўцаў.

– **Раскажыце, калі ласка, як Вы трапілі ў гэту краіну?**

– 26 верасня 1983 года мне, васямнаццацігадоваму хлопцу, прыйшла павестка з ваенкамата аб прызыве на тэрміновую вайсковую службу. Спачатку трапіў у Мар'іну Горку, дзе праходзіў курс маладога байца. Затым разам з іншымі саслужыўцамі цягніком адправіўся ў далёкі Казахстан. Пасля двух з паловай месяцаў фізічных трэніровак, навучання рукапашнаму бою, стральбе з усіх відаў зброі вайсковае камандаванне паведаміла: нас накіроўваюць у Дэмакратычную Рэспубліку Афганістан.

**– Якімі былі першыя ўражанні, калі ступілі на чужую зямлю?**

– Невядомасць. Мы, мадалыя салдаты, не ведалі, што нас тут чакае, што будзе заўтра, паслязаўтра. Яшчэ ў перыяд праходжання падрыхтоўкі ў Казахстане мяне абучалі навыкам язды на ГАЗ-66. Службу сваю тут я пачаў у горадзе Баграм у асобным разведвальным батальёне. У першы ж дзень выдалі баявую зброю – аўтамат Калашнікава (АК-74).

**– Памятаеце сваю першую сутычку з душманамі?**

– Канечне. Было гэта 2 студзеня 1984-га. Нас ноччу паднялі па баявой трывозе. Удзельнікі бандфарміраванняў абстрэльвалі наш транспарт на дарозе, якая вяла ў Кабул. Гэта была галоўная дарожная артэрыя для пастаўкі савецкім войскам узбраення і харчавання. Падчас перастрэлкі мы змаглі адбіць атаку ворага, а таксама захапілі ў палон некалькі душманаў. Тады я ўпершыню ўбачыў, як страляюць у чалавека, як яго забіваюць.

**– Якія заданні Вам даводзілася выконваць?**

– Першыя паўгода я быў разведчыкам. Пасля вайсковае камандаванне даручыла бронетранспарцёр БТР-70, на якім я служыў да самай дэмабілізацыі. Асноўная задача заключалася ў ахове перавалаў. Дарэчы, на сваім БТР давялося аб'ездзіць амаль усю тэрыторыю Афганістана. Часта трапляў пад абстрэл.

**– Васілій Савіч, а весткі з дому прыходзілі?**

– Безумоўна, з бацькамі я вёў пастаянную перапіску. Але з-за ваеннай цэнзуры нельга было паведамляць, што тут ідуць ваенныя дзеянні. Тата і мама ў сваіх лістах пісалі, як мілагучна спяваюць над

Дзісной салаўі, які духмяны водар вее ад квітнеючых майскіх садоў. Ад гэтага моцна сціскалася сэрца ў грудзях. Настальгічна балела душа.

**– Вяртанне на радзіму і сустрэча з роднымі былі доўгачаканымі і незабыўнымі?**

– Я ехаў цягніком з Ашхабада да Масквы, потым трапіў у Мінск, а пасля ў Шаркаўшчыну. Загадзя ведаючы пра мой прыезд, на парозе роднай хаты сустрэлі бацькі. У гарачых абдымках з нашых вачэй міжволі цяклі слёзы. Гэта былі слёзы радасці. Мне пашчасціла вярнуцца дадому жывым.

**– Паслязаўтра, у Дзень памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў, шаркаўчане, якія прайшлі дарогамі Афганістана, зноў сустрэнуцца ў раённым цэнтры?**

– Так. Кожны год ўсе тыя, хто выканаў свой інтэрнацыянальны абавязак, хто застаўся ў жывых і вярнуўся на сваю радзіму, збяруцца ў скверы ДРБУ-131 каля помніка «Чорны цюльпан», каб аддаць даніну павагі загінуўшым у афганскім пекле, тым, хто назаўсёды застаўся ляжаць у чужой зямлі. Разам мы ў думках прыгадаем гады службы, якія засталіся ў нашай памяці назаўсёды.

**– Васілій Савіч, што Вы пажадаеце воінам-афганцам, іншым шаркаўчанам, якія неслі нялёгкую службу ў «гарачых кропках»?**

– У першую чаргу я жадаю ўсім трывалага здароўя. Няхай у сем'ях заўсёды пануе дабрабыт і згода. Веру, што наша афганскае братэрства застанецца непахісным на будучыя гады.

– **Вялікі дзякуй Вам за размову!**

**Гутарыў Сяргей РАЙЧОНАК.**